Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Журналістку «Белсату» Вольгу Чайчыц аштрафавалі на 40 базавых велічыняў

12.05.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Журналістка Вольга Чайчыц

Суд Дзяржынскага раёну (па месцы рэгістрацыі журналісткі) прысудзіў **Вользе Чайчыц** штраф у памеры Br 920 (40 базавых велічыняў) за онлайн-трансляцыю з Барысава. Разглядаў справу суддзя **Крупец Сяргей**.

Па інфармацыі прэс-службы БАЖ, 18 сакавіка ў Барысаве была запланаваная пратэставая акцыя, якая ў выніку так і не адбылася, але пры гэтым міліцыянты затрымалі журналістаў «Белсату» Вольгу Чайчыц і Сяргей Кавалёва, што збіраліся асвятляць падзею.

Пазней на Вольгу Чайчыц быў складзены пратакол паводле арт. 22.9 (незаконны выраб прадукцыі СМІ) КаАП РБ. У якасці сведак абвінавачвання на судзе выступілі міліцыянты, якія праводзілі затрыманне.

> *«Адзін з міліцыянтаў па прозвішчы Якімовіч, сказаў: яго асабіста абурыла, што скрыншоты з трансляцыі разышліся па сацыяльных сетках і яго ўбачылі ўсе знаёмыя ў горадзе. Ён жа дадаў, што на момант, калі пачалася трансляцыя, ужо паступіў загад затрымаць нас»,* – гаворыць Вольга Чайчыц.

Журналістка падкрэсліла, што падчас перапынку ў судзе вядучая спецыялістка установы Дар'я Уварава забараніла рабіць фота і здымаць відэа, чым, паводле слоў Чайчыц, парушыла яе правы і дзейнае заканадаўства.

Раней Вольгу Чайчыц аштрафавалі на 25 базавых велічыняў за стрым з пратэставай акцыі ў Віцебску 25 сакавіка.

У канцы мінулага тыдня дырэктар «Белсату» Агнешка Рамашэўская-Гузы ініцыявала кампанію па падтрыманні журналістаў каналу, якія трапілі пад рэпрэсіі ў выглядзе затрымання і судоў.

Твитнуть











"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023









## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ






## Напрамкі дзейнасці

## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY